# Дадатковы матэрыял да ўрокаў беларускай мовы ў ІІ класе



**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка.

*У сувязі са зменамі, якія адбыліся ў тыпавым вучэбным плане пачатковай школы ў 2016/2017 навучальным годзе, павялічылася колькасць гадзін на вывучэнне беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання. Гэта выклікала неабходнасць абнаўлення вучэбнай праграмы па беларускай мове з пункту гледжання павелічэння колькасці гадзін на вывучэнне асобных раздзелаў. Да таго раздзел "Сказ" дапоўнены тэмай "Сувязь слоў у сказе", у раздзел "Тэкст" уключана тэма "Падзел тэксту на часткі".*

*Прапануем дыдактычныя матэрыялы да тэм, якія прадстаўлены ў новых праграмах, але адсутнічаюць у падручніку аўтара В. І. Свірыдзенкі "Беларуская мова" для ІІ класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання (Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015). Дыдактычныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны на ўроках беларускай мовы пры вывучэнні раздзелаў "Словы", "Сказ" у IV чвэрці навучальнага года.*

### Словы, якія называюць прадметы

**1.** Прачытайце верш. Дапішыце неабходныя словы ветлівасці. Чаму з ласкавымі словамі трэба звяртацца не толькі да людзей, але і да жывёл, раслін?

Расці, дрэўца,
расці, траўка,
расці, краска,
______________.
Я вас не забуду —
паліваць вас буду.

*В. Жуковіч* [1, с. 250].

***краска*** — кветка

*Словы для даведак:* калі ласка! Вялікі дзякуй! Дабранач! Добры дзень!

Падкрэсліце ў вершы словы, якія абазначаюць прадмет. Назавіце іх адным словам. Вусна пастаўце да іх пытанні.

**2.** Адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку. У дужках пастаўце да яго пытанне.

Тук-тук-тук ды ток-ток-ток —
беражыся, эй, цвічок!
Не паспееш мне сустрэцца —
толькі шапка застанецца. ______________

*С. Шах* [8, с. 81].

Знайдзіце ў загадцы словы, якія абазначаюць прадмет. Зверху над гэтымі словамі запішыце пытанні да іх.

Перакладзіце пры дапамозе слоўніка слова *цвічок* на рускую мову.

**3.** Прачытайце радкі слоў. Закрэсліце ў кожным радку лішняе слова. Растлумачце свой выбар.

| | |
|---|---|
| Урач, міліцыянер, прадавец, прадаваць. | з'явы прыроды |
| Мячык, лялька, кубікі, гуляць. | транспарт |
| Дождж, снег, навальніца, дажджавы. | прафесіі |
| Машына, электрычка, тралейбус, электрычны. | цацкі |

Словы ў радках злучыце з адпаведнымі словамі ў рамках.

**4.** ***Гульня "Шалі"***



Якіх слоў больш?

Вераб'і, дзяўчынка, відэлец, ластаўка, талерка, гарбуз, сусед.

*што?* *хто?*

______________ ______________
______________ ______________
______________ ______________
______________ ______________

Запішыце словы пад адпаведнымі чашамі шаляў.

**5.** Разгадайце рэбус. Запішыце слова-адгадку.



______________________________

Дапоўніце сказы слоўнікавым словам.

Рухомая ____________ ў метро — гэта эскалатар.

Маленькая прыстаўная ____________ — гэта драбінкі, лескі.





Падкрэсліце ў сказах словы, якія абазначаюць прадметы. Вусна пастаўце да іх пытанне.

**6.** Д/з Адгадайце загадку. Спішыце яе. Запішыце слова-адгадку.

Вось праява — ну і ну!
Кульгавая дарога
палезла на сцяну. ______________

*А. Клышка* [1, с. 310].

***кульгавая*** — рус. хромая

***праява*** — незвычайнае здарэнне

Падкрэсліце ў сказах словы, якія абазначаюць прадмет. Зверху над гэтымі словамі запішыце пытанні да іх.

## Словы, якія называюць прыметы прадметаў

**7.** Зафарбуйце чырвоным колерам фрагменты мазаікі, на якіх запісаны словы, што называюць прыметы прадметаў.




Назавіце прадмет на малюнку. Дапоўніце гэтым словам сказ. Падкрэсліце хвалістай лініяй у сказе слова, якое называе прымету прадмета.

Маленькі __________ — гэта яблычак.

**8.** ***Гульня "Ланцужкі"***

Збярыце "ланцужкі" слоў: прадмет — пытанне — прымета прадмета. Злучыце адпаведныя словы і пытанні.




**9.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Летні (дз, д)ень го(д, т) кормі(т, ц)ь.

Падкрэсліце слова, якое абазначае прымету прадмета. Вусна пастаўце да яго пытанне.

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс. Закрэсліце ў дужках непатрэбныя літары.

**10.** Да слоў — назваў прымет падбярыце словы — назвы прадметаў. Запішыце гэтыя словы.

далекая незнаемая шырокая

______________



высокі прыгожы шмат-павярховы



высокае стройнае зяленае



маленькія шэрыя шустрыя



**11.** Прачытайце тэкст. Устаўце ў сказы патрэбныя словы — назвы прымет. Вусна пастаўце да іх пытанні. Пра якога звярка ідзе размова ў тэксце?

______________

Гэты ______________ звярок жыве ў лесе. У яго______________ вушы і ______________ хвост. Пярэднія лапы ў звярка ______________, а заднія — ______________. Футра ў яго летам ______________, а зімой — ______________. Морква, капуста — любімая ежа звярка.

*Словы для даведак:* маленькі, доўгія, кароткі, кароткія, шэрае, белае.

Дайце назву тэксту. Вусна пастаўце да гэтага слова пытанне.

**12.** Да слоў з правага слупка падбярыце словы з левага слупка. Злучыце іх лініямі.

| | |
|---|---|
| сырое | плашч |
| мокры | надвор'е |
| духмяная | ландыш |
| пахучы | булка |
| старажытны | горад |
| старое | вядро |

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі:

У ______________надвор'е лепш пасядзець дома. (сырое, мокрае, вільготнае)

У лесе расцвіў ______________ ландыш. (духмяны, пахучы, водарны)

Мы былі на экскурсіі ў ______________ горадзе. (старажытным, старым, даўнім).

**13.** Д/з Дапоўніце тэкст словамі, якія абазначаюць прымету прадмета.

Наляцеў ______________ вецер. Трывожна зашумеў ______________ лес. Па **небе** пагрозліва сунулася ______________ хмара. Раскаціста прагрымеў гром. Неба прарэзалі ______________ маланкі. І раптам як з вядра паліў ______________ ______________ дождж.

*Паводле Я. Галубовіча* [3, с. 50].

*Словы для даведак:* моцны, чорная, сасновы, яркія, цёплы, летні.

## Словы, якія называюць дзеянні прадметаў

**14.** ***Гульня "Ланцужкі"***

Збярыце "ланцужкі" слоў: прадмет — пытанне — дзеянне прадмета. Злучыце адпаведныя словы і пытанні.

урач

будуюць

будаўнікі

што робяць?

вучыць

настаўніца

што робіць?

выступаюць

артысты

лечыць

**15.** Змяніце словы па ўзоры, вусна пастаўце да іх пытанні.

*Узор:* хадзі — хаджу.
глядзі — ______________
сядзі — ______________

Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць гукі [дз'], [дж].

Дапоўніце сказы словамі, якія атрымаліся.

Я ______________ па лесе. Я ______________ на кветкі. Я ______________ на пяньку і слухаю птушак.

**16.** Злучыце часткі прыказак. Чаму так гавораць?

Лепей крышку зрабі,

а гавары мала.

Слухай многа,

чым багата нагавары.

Знайдзіце ў прыказках словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета. Вусна пастаўце да іх пытанні. Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.

**17.** Прачытайце загадку і адгадайце яе. Запішыце слова-адгадку. Закрэсліце непатрэбныя літары ў словах. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянне прадметаў.

Гняз(д, дз)ечка не бу(д, дз)уе  
і (д, дз)етак не гадуе.  
Такая вось матуля,  
заву(т, ц)ь яе ___________.

*Л. Багдановіч* [2, с. 15].

**18.** Прачытайце верш.

**Мышаняты-мастакі**

Мышаняты сябравалі,  
кошку разам малявалі.  
Ажыла... Чакай б(е,я)ды!  
Разб(е, я)гайся хто куды!

*Т. Мушынская* [7, с. 6].

**П** Закрэсліце непатрэбныя літары ў словах. Знайдзіце ў вершы словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета. Вусна пастаўце да іх пытанні. Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.

**19.** Дапоўніце тэкст словамі, якія абазначаюць дзеянне прадмета.

**Голас вясны**

З ледзяшоў адна за другой ___________ празрыстыя кроплі. Яны ___________ ў снезе круглыя ямкі. Вераб'і ___________ ў першай веснавой вадзе. Пырскі ___________ ад гэтых купальшчыкаў. На цёмным снезе ___________ жучкі і камарыкі. Усе пачулі голас вясны.

*Паводле М. Даніленкі* [4, с. 37].

*Словы для даведак:* падалі, выбівалі, купаліся, разляталіся, поўзалі.

**?!** Раскажыце пра змены, якія адбываюцца ў прыродзе вясной? Якія гукі можна пачуць увесну?

**20.** Прачытайце сказы. Падкрэсліце ў іх словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета.

Вада закіпела. Дзядуля ідзе. Дзеці плачуць. Матуля ўсміхнулася. Хлопчык плаваў у басейне. Самалёт ляціць.

**П** Дапоўніце гэтымі словамі сказы пад малюнкамі.



Работа ___________.



Дождж ___________.



Ледзяшы ___________.



Сонейка ___________.



Вучань ___________ каля дошкі.



Час ___________.

**21.** Д/з Прачытайце і адгадайце загадкі. Запішыце словы-адгадкі. Устаўце замест пропускаў раздзяляльны мяккі знак або апостраф.

1. Адзін л_е, другі п_е, трэці зелянее і расце.

___________________________________________

___________________________________________

2. Зімою хаваюся, вясною з_яўляюся, летам весялюся, восенню спаць кладуся [5, с. 62].

___________________________________________

*Словы для даведак:* рака; дождж, зямля і расліны.





**П** Падкрэсліце ў загадках словы, якія абазначаюць дзеянне прадметаў.

**Сказ (сувязь слоў у сказе)**

**22.** Прачытайце выказванні. Адзначце тыя, якія з'яўляюцца памылковымі выказваннямі. Змяніце іх так, каб выказванне стала правільным. Запішыце сказы, правільна афарміўшы на пісьме.

☐ Прыгожая кветка намалявала Наташу.  
☐ Павел выразна чытае верш.  
☐ Цікавая кніга ляжыць на паліцы.  
☐ У дубе расце лес.

Падкрэсліце ў запісаных сказах словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**23.** Прачытайце сказы. Закрэсліце адно слова ў кожным сказе так, каб сказы сталі правільнымі выказваннямі.

Маленькі Саша весела заплакаў.

Па дарозе папоўз калючы гладзенькі вожык.

Зайчык скакаў цераз пянькі, кусцікі чарніц, сосны.

**24.** Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова.




______________________________

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Праход, які злучае асобныя часткі кватэры, — гэта ______________.

Невялікі калідор — гэта ______________.

Супрацоўнік гасцініцы, які абслугоўвае нумары, — гэта ______________.

*Словы для даведак:* калідорны, калідор, калідорчык.

**25.** Злучыце рускія спалучэнні слоў з беларускімі адпаведнікамі.

| | |
|---|---|
| поздоровался с соседом | павітаўся з суседам |
| дараваў сястрычцы | поблагодарил мальчика |
| простил сестричке | падзякаваў хлопчыку |

Пісьмова адкажыце на пытанні, выкарыстаўшы словы для даведак.

З кім павітаўся Сяргейка каля пад'езда?

______________________________

Каму Сяргейка дараваў даўнюю крыўду?

______________________________

Хто падзякаваў хлопчыку за смачны яблык?

______________________________

*Словы для даведак:* з суседам, сястрычцы, сябар.

Падкрэсліце ў запісаных сказах словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. Вусна пастаўце пытанні да іншых слоў у сказах.

**26.** Дапоўніце сказы па пытаннях.

Дрэвы растуць (дзе?)__________.

(Якая?)__________ дзяўчынка ідзе па вуліцы.

Дзеці збіраюць (што?) __________.

*Словы для даведак:* у лесе, грыбы, маленькая.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**27.** Вызначце межы сказаў.

Прыйшла в..сна школьны сад стаіць у з..лёным убранні лёгкі ветрык калыша в..рхавіны дрэў вес..ла сп..ваюць птушкі

Спішыце сказы, правільна аформіўшы іх на пісьме.

Назавіце ў першым сказе словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Устаўце патрэбныя літары ў словы. Растлумачце правапіс **е**, **ё** — **я**.

**28.** Д/з Расстаўце словы так, каб атрымаўся сказ. Запішыце скорагаворку Уладзіміра Мацвеенкі. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Козачка | купіла | казляняткам

кошык | капусты [6, с. 19].

______________________________

Падкрэсліце ў запісаным сказе словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. Вусна пастаўце пытанні да іншых слоў у сказе. Падкрэсліце прыназоўнік.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэст. / склад. М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. — Мінск : Выш. шк., 2003. — 638 с.
2. Вясёлка. — 2007. — № 6.
3. Галубовіч, Я. Дзівосы роднай прыроды : апав. і казкі для дзяцей / Я. Галубовіч ; маст. К. Разанкова. — Мінск : Пачатк. шк., 2012. — 168 с.
4. Даніленка, М. П. Як дажджы паміраліся : апав., казкі : кн. для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Даніленка. — Мінск : Нар. асвета, 2013. — 56 с.
5. З любоўю да мовы : практ. матэрыял для настаўнікаў пачатк. кл. / склад. І. А. Гімпель, Г. В. Нарубіна. — Мінск : Беларус. вучэб.-метад. цэнтр, 1992. — 186 с.
6. Мацвеенка, У. І. Займальны родны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / У. І. Мацвеенка. — Мінск : Маст. літ., 2013. — 48 с.
7. Мушынская, Т. М. Вожыкі ў футбол гуляюць : вершы, апав., казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Т. М. Мушынская ; маст. Г. С. Хінка-Янушкевіч. — Мінск : ЛІМ, 2008. — 136 с. : іл.
8. Шах, С. М. Вучым гаварыць і думаць / С. М. Шах. — Мінск : Нар. асвета, 1998. — 96 с.